драмы, в котором характеры, ситуации и действие представлены в смешных формах или проникнуты комическим» [1, с. 161].

Целью комедий в эпоху классицизма стали пропаганда идей Просвещения и осмеяние пороков, которые традиционно были выражены в мотовстве, глупости, жадности, лени героев. А. П. Сумароков, родоначальник русской драматургии, автор первой русской комедии, писал: «Свойство комедии издевкой править нрав» [2, с. 121].

Новая русская комедия возникла к началу второй половины XVIII в. К этому времени литература уже играла значительную роль в культурной жизни страны и была связана с важнейшими событиями русской истории.

Первые русские комедии А. П. Сумарокова «Нарцисс» и «Тресотиниус» были написаны в начале 1750-х г., поэтому вполне логичным является вывод, что только следующие 50 лет падают на развитие этого литературно-театрального жанра в России в XVIII в.

Русская комедия данного периода имеет свои жанровые разновидности: в творчестве А. П. Сумарокова это памфлетная комедия («Тресотиниус» и др.), комедия интриги и характера («Опекун» и др.) и комедия нравов («Рогоносец по воображению» и др.). Далее комедия приобретает следующие модификации: комедия характеров (Н. П. Николев «Самолюбивый стихотворец»), «слёзная комедия», или мещанская драма (М. М. Херасков «Безбожник»), и высокая комедия (В. В. Капнист «Ябеда»). В этих жанровых разновидностях по-разному отражалась русская действительность.

Комедия второй половины XVIII в. внесла значительный вклад в становлении русской комедии, оказала влияние на развитие русского национального театра и подготовила стих для комедии А. С. Грибоедова «Горе от ума».

**Литература**

1 Кожевников, В. М. Литературный энциклопедический словарь / В. М. Кожевников, П. А. Николаев. – М.: Советская энциклопедия, 1987. – 752 с.

2 Сумароков, А. П. Избранные произведения / А. П. Сумароков. – Ленинград: Советский писатель, 1957. – 606 с.

***А. В. Канаваленка***
*Навук. кір.* ***В. К. Шынкарэнка****,*
*д-р філал. навук, дацэнт*

## СІВЫХ СТАГОДДЗЯЎ ПЕРАЗОВЫ

Заўсёдны інтарэс мастакоў слова да шматвяковай мінуўшчыны найперш абумоўлены магчымасцю атрымаць адказ на шэраг канцэптуальных пытанняў. Больш дакладна: як суадносіцца асоба і час, як рэалізуецца чалавек у часе; хто ёсць «Я» як прадстаўнік сваёй нацыі, хто ёсць «Мы» як народ у гісторыі, дзе нашыя карані і ў чым іх сіла? Менавіта таму лепшыя творы дадзенай тэматыкі, напісаныя Уладзімірам Арловым, Леанідам Дайнекам, Генрыхам Далідовічам, Вольгай Іпатавай, Ягорам Коневым, Алесем Наварычам, Людзмілай Рублеўскай, Вітаўтам Чаропкам і іншымі, скіраваны на ўсебаковае ўзбагачэнне сучаснікаў праз засваенне неацэннага эмпірычнага і маральна-духоўнага вопыту папярэднікаў.

Л. Дайнека, што першапачаткова яшчэ ў паэзіі выявіў непадробную цікавасць да тэмы мінулага і непарыўнай повязі сівых вякоў з сучаснасцю, працягвае распрацоўваць яе і ў буйных эпічных формах. На сёння творы пісьменніка «Меч князя Вячкі», «След ваўкалака» і «Жалезныя жалуды», якія ўтварылі своеасаблівы гістарычны раманны цыкл, сталі ўжо праграмнымі. Адметна, што іх сюжэтна-кампазіцыйная прастора звязана не толькі з лёсамі і дзейнасцю выключна гістарычных асоб (Вячка, Уладзіслаў, Міндоўг), але і са зваротам аўтара да характараў звычайных людзей, не менш яркіх выдуманых герояў (Мірошка, Якаў, Валасач і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Поспех у цэлым традыцыйнай (за выключэннем хіба толькі рамана «Назаві сына Канстанцінам») гістарычнай прозы Л. Дайнекі можна вытлумачыць нетыповасцю творчага мыслення мастака, яго арыгінальным філасофскім бачаннем даўніны, сінтэзам рэалістычнага і рамантычнага пачаткаў, арганічным спалучэннем дакументальнасці, домыслу і фантазіі, плённым выкарыстаннем фальклорных элементаў, а таксама сюжэтнай дынамікай і псіхалагізмам твораў, у выніку чаго з’явы мінуўшчыны пачынаюць успрымацца не як прывідна-архаічныя, а як жывыя, поўныя драматызму і безлічы выпрабаванняў, старонкі мінуўшчыны.

Якраз удумлівы падыход да асэнсавання айчыннай і сусветнай гісторыі дазваляе творцу аргументавана настойваць на наступнай ісціне: нельга пакідаць без увагі, а тым больш у забыцці, мінулае і папярэднікаў, бо гісторыя жорстка помсціць тым, хто не памятае яе, не хоча ўслухоўвацца ў мудрасць пеларазоваў сівых вякоў.

***Н. В. Канцавая***
*Навук. кір.* ***А. М. Мельнікава,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## МІКРАГІСТОРЫЯ І ЛІТАРАТУРА

Гісторыя штодзённасці ў наш час стала асобнай галіной гуманітарнай навукі. Пад гісторыяй штодзённасці ў мастацкай літаратуры мы разумеем апісанне побыту, этыкету, нацыянальных страў, строяў і да т. п.

Сама тэма гісторыі штодзённасці для беларускага літаратуразнаўства мае абсалютна наватарскі характар, нягледзячы на тое, што адлюстраванне спецыфікі побыту, умоў жыцця, касцюма прысутнічае ў творах многіх пісьменнікаў.

Так, у творах Ул. Караткевіча пададзена вялікая колькасць апісанняў шляхецкай штодзённасці. Аўтар апісвае шляхецкае адзенне, спецыфіку этыкету, стравы. Акрамя вопраткі Ул. Караткевіч падае апісанні панскага застолля: «Ялавічына, бараніна, смажаныя гусі, кюмель, мёд, гарэлка – усё знікала ў бяздонных жыватах» [1, с. 103].

Я. Купала ў сваёй творчасці адлюстроўваў адметнасці як сялянскай, так і шляхецкай штодзённасці.

Шмат адзнак беларускай штодзённасці пададзена ў творах В. Ластоўскага. Так, пісьменнік называе беларускія стравы: кумпячына, сальцісон, каўбасы. Апісвае спецыфіку пахавання памерлых: «Корста – тоўстая калода з высечаным усярэдзіне дуплом, у якое клалі нябожчыка; верх закрывалі плашкай ад такой жа калоды» [2, с. 129].

Паводле І. Пякарскага, на сялянскіх палях раслі жыта, авёс, ячмень, грэчка і бульба, у агародах – капуста, буракі, морква, рэпа, бруква, цыбуля і часнык. Сялянскія патрэбы ў хлебе задавальняліся. Апроч хлеба людзі харчаваліся бульбай, якая ўжывалася як сама па сабе, а таксама як дадатак да мукі пры выпечцы хлеба. Сялянскі рацыён дапаўняла згаданая гародніна, а таксама гарох, бабы і сачавіца [3, с. 42].

Дзякуючы творам літаратуры мы пазнаём край, жыццё народа ў гэтым краі, пазнаём сябе, адкрываем свет, а таксама імкнемся зразумець Чалавека ў айчыннай гісторыі, матывы яго паводзінаў, каштоўнасныя арыенціры.

### Літаратура

1 Караткевіч, Ул. Збор твораў. У 8 т. Т. 2. Аповесці, апавяданні, казкі / Ул. Караткевіч; пад рэд. С. А. Андраюка. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1988. – 506 с.

2 Ластоўскі, В. Бяздоннае багацце / В. Ластоўскі. – Мінск: Юнацтва, 2001. – 204 с.

3 Смалянчук, А. Беларуская гісторыя: знайсці чалавека / А. Смалянчук – Мінск: І. П. Логвінаў, 2013. – 155 с.

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЕНІ Ф. СКАРЫНЫ